# Не проста цуд — сімвал сталіцы

---

16.06.2016

Занясенне на Рэспубліканскую дошку Гонару стала прыемнай навіной для калектыву Нацыянальнай бібліятэкі акурат напярэдадні свята — сёння якраз дзесяць гадоў, як  расчыніў свае дзверы яе новы будынак

Сёння складана ўявіць Мінск без «дыямента ведаў» — бібліятэкі, чыя «кватэра» за гэты час ужо паспела ператварыцца ў сапраўдны брэнд горада. «Нацыяналка» сустракае гасцей і мінчан, дае магчымасць з агляднай пляцоўкі зірнуць на сталіцу з вышыні птушынага палёту, яе дзверы заўсёды адчыненыя для студэнтаў, прафесійных даследчыкаў і проста цікаўных чытачоў. Тут вас гасцінна прывітаюць на шматлікіх выстаўках, прэзентацыях, фестывалях.

---



Зрэшты, Нацыянальная бібліятэка Беларусі — гэта не проста сховішча кніг і інфармацыйных рэсурсаў. Гэта сацыякультурны, метадычны цэнтр, які, разам з самім будынкам вырас, пасталеў і развіўся ў сапраўды ўнікальную ўстанову.

— Сёння ў адпаведнасці са сваёй місіяй наша бібліятэка вырашае як традыцыйныя задачы захавання культурнай дакументальнай спадчыны, так і новыя — стварэнне электроннай бібліятэкі, фарміраванне і выкарыстанне інфармацыйных рэсурсаў, — кажа **дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі, доктар педагагічных навук, прафесар Раман МАТУЛЬСКІ.** — Рэалізуючы функцыі сацыякультурнага цэнтра, мы развіваем традыцыі культурна-асветніцкіх устаноў сусветнага значэння.

І сапраўды, наша Нацыянальная бібліятэка працуе на карысць не толькі беларусаў. Яе віртуальнымі гасцямі з'яўляюцца чытачы з усяго свету. Больш як тры чвэрці карыстальнікаў бібліятэкі наведваюць яе менавіта праз інтэрнэт-партал установы.

— Дзякуючы пашырэнню колькасці паслуг, што прадастаўляюцца на нашым партале для віртуальных наведвальнікаў, мы значна пашырылі геаграфію працы з чытачамі. Не так істотна, дзе ты жывеш, — у Мінску, Брэсце, Лондане ці Зімбабвэ, любы чалавек можа скарыстацца нашымі пошукавымі сістэмамі, атрымаць неабходную інфармацыю ў выглядзе лічбавай копіі дакумента ці яго фрагмента, — дадае **намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Алесь СУША.**

Часта здараецца так, што госці горада ці краіны, прыйшоўшы на экскурсію ў «нацыяналку», становяцца яе сталымі чытачамі. Дарэчы, запісацца ў бібліятэку могуць як грамадзяне нашай дзяржавы, так і замежнікі.

За гэтае дзесяцігоддзе ў Нацыянальнай бібліятэцы зроблена шмат і ў кірунку ажыццяўлення выдавецкай дзейнасці. Сёння тут выходзяць як метадычныя дапаможнікі для бібліятэкараў, так і факсімільныя выданні, навукова-папулярныя кнігі.

— Час, калі многае змяняецца, менавіта ў галіне выдавецкай дзейнасці для нас атрымаўся даволі плённым. Мы сталі паўнавартасным выдавецкім цэнтрам, былі аднымі з першых сярод устаноў культуры, хто пачаў афіцыйна выпускаць электронныя выданні, — расказвае Алесь Суша. — Вялікую працу мы робім і для пашырэння ведаў пра нашу культурную спадчыну, выдатных пісьменнікаў, мастакоў.

Дзесяцігоддзе таму, адразу пасля адкрыцця новага будынка, было шмат ахвотнікаў проста трапіць у бібліятэку, пабачыць яе знутры. Сёння сапраўды многае змянілася: беларусы не ўспрымаюць саму бібліятэку як дзіва, ды і ўстанова не стаіць на месцы, жыве актыўным жыццём, праводзіць мноства імпрэз і ладзіць шмат праектаў, карысных для развіцця беларускай культуры.